І. І. Паўлоўскі, Л. Ф. Леўкіна

Беларуская мова

Падручнік для 2 класа
агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках
Частка 2

Зацверджана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

2-е выданне,
перагледжанае і дапоўненае

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2011

УДК 811.161.3(075.2=161.3)
ББК 81.2Беи-922
П21

Р э ц э н з е н т

кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта
пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(канд. пед. навук, дацэнт *В. І. Свірыдзенка*)

Паўлоўскі, І. І.

П21 Беларуская мова : падручнік для 2-га кл. агульнаадукац. установ з беларус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 2 / І. І. Паўлоўскі, Л. Ф. Леўкіна. 2-е выд., перагледж. і дап. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2011. — 120 с. : іл.

ISBN 978-985-465-823-0.

УДК 811.161.3(075.2=161.3)
ББК 81.2Беи-922

ISBN 978-985-465-823-0 (ч. 2)
ISBN 978-985-465-821-6



ТЭКСТ



Што такое тэкст?
Як адрозніць тэкст ад сказа?

1. Прачытайце.



Пчолы

Пчолы — нястомныя працаўніцы. Яны збіраюць салодкі нектар з кветак і пераносяць яго ў вулей. Чым больш кветак на лузе, тым больш мёду наносяць пчолы.

Колькі тут сказаў? Ці звязаны па сэнсе ўсе сказы? Ці ва ўсіх сказах гаворыцца пра пчол? Які загаловак мае тэкст?

Некалькі сказаў, звязаных паміж сабой па сэнсе, называюць ***тэкстам.*** У тэксце кожны наступны сказ развівае, працягвае думку папярэдніх.

2. Прачытайце. Ці з'яўляецца запісанае тэкстам? Чаму вы так думаеце?

Пчала — гэта насякомае. Хлопчык убачыў матылька. Птушкі адляцелі ў вырай.

Некалькі сказаў, у якіх няма агульнай думкі, тэкстам не з'яўляюцца. Такія сказы не звязаны па сэнсе.

3. Прачытайце. Ці можна сказаць, што вы прачыталі тэкст? Чаму?

рукза́к

Соня збіраецца ў школу. А яе мало**д**шы бра**т** Алік ходзіць вакол і ця**ж**ка ўздыхае. Ён просіць узяць і яго **ў** школу. Але яму яшчэ рана. Толькі праз го**д** Алік пойдзе **ў** першы кла**с**.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

4. Прачытайце. Знайдзіце сказ, які стаіць не на сваім месцы.

Памочнік

У нас дома ўборка. Я мыю падлогу. Ён памахаў хвастом, потым пачаў хапаць, цягнуць анучу. Тут падышоў мой сабака Нікі.

— Ну, Нікі, тады мый падлогу сам. Толькі добра мый.



5. Прачытайце. Вызначце межы сказаў.

Быў цёплы дзень ззяла сонейка па небе плыло воблачка спачатку яно было падоб-

нае на белага коніка потым стала маленькай кветачкай праз некаторы час і зусім знікла.

Запішыце сказы.

Першы сказ тэксту пачынайце пісаць з ***чырвонага радка****. Кожны наступны сказ пішыце з вялікай літары, а ў канцы сказа стаўце кропку.

**Чырвоны радок* — водступ у пачатку радка.

6. Прачытайце тэкст. Устаўце словы, якія падыходзяць па сэнсе.

Аднойчы Алёша ехаў у горад. На прыпынку ў аўтобус увайшла бабулька. Алёша падняўся і сказаў: «…». Бабулька села і падзякавала хлопчыку: «…».

Словы для даведкі: *дзякуй, калі ласка, вялікі дзякуй, шчыры дзякуй, дзякую табе, сядайце.*



7. Прачытайце. Запішыце сказы ў такім парадку, каб атрымаўся тэкст.

У глыбокіх дуплах нахавалі арэхаў.
Яны насушылі грыбоў.
Цяпер зіма ім не страшная.
Вавёркі падрыхтаваліся да зімы.

ТЭМА ТЭКСТУ



Што такое тэма тэксту?

8. Прачытайце.



Воблачка

Устала сонейка. Лясныя жыхары ўзяліся за працу. Толькі воблачка лётала туды-сюды, бо нічога не ўмела рабіць. Ніхто з ім не гуляў. Сумна яму стала. Заплакала воблачка. І тут зазелянела траўка. Усе былі рады дожджыку. Узрадавалася і воблачка. Гэта яно зрабіла дожджык *(Паводле М. Шубіча)*.

Пра што расказваецца ў гэтым тэксце?

Тэма **— гэта тое, пра што гаворыцца ў тэксце.**

9. Прачытайце загалоўкі да тэкстаў. Як вы думаеце, на якія тэмы гэтыя тэксты?

Прачытайце тэксты. Ці падказалі вам загалоўкі тэмы тэкстаў?

На горцы

Каля школы была ледзяная горка. Увесь дзень на ёй гурт дзяцей. У Сярожы і Мішы санкі самыя вялікія. Прыйшлі малышы. Сярожа паклікаў іх на свае санкі. Дзеці ўселіся і пакаціліся з горкі.

Разам так весела!

Рыжы сябар

Вольга часта ходзіць у парк. Там жыве яе рыжы сябар. Гэта маленькая вавёрачка з пушыстым хвастом. Вольга стукае па сасне. Звярок скача з галінкі на зямлю. Дзяўчынка працягвае руку. Вавёрачка хутка бярэ корм. І вось яна зноў на дрэве.

10. Прачытайце. Пра што гэты тэкст? Прыдумайце загаловак да тэксту.

Я люблю кветкі. Любоў гэта перадалася мне ад маці. Яна кожны год разводзіць ярка-чырвоныя гваздзíкі, беласнежныя гладыёлусы, блакітныя флёксы і хрызантэ́мы. Даглядаць кветкі — мой любімы занятак. З кветкамі жыццё становіцца прыгажэйшым *(Паводле Т. Хадкевіча)*.

Спішыце першы і апошні сказы.

11. Параўнайце два тэксты. Назавіце іх тэму.

Мой любімы занятак

Я люблю чытаць кнігі. У кнігах можна прачытаць пра падарожжы і дзівосныя прыгоды, пра цікавых людзей, пра звяроў і птушак — пра ўсё на свеце.

Чытайце кнігі, сябры!



Мой любімы занятак



Я люблю займацца спортам.

Я хаджу на лыжах, гуляю ў футбол, катаюся на санках. Спорт — гэта здароўе і бадзёры настрой.

Займайцеся спортам, сябры!

12. Прачытайце. Вызначце тэму тэксту.

Лес — наш з**я**лёны с**я**бар.

Лес нас корміць ягадамі і грыбамі. Лес нас грэе і дровамі, і сценамі хат. Лес нас бароніць у выпадку неб**я**спекі. Чалавек і лес — родныя.

Кожны беларус любіць лес *(Паводле У. Караткевіча)*.

Запішыце сказ, які можа быць загалоўкам да тэксту.

Падрыхтуйцеся растлумачыць правапіс выдзеленых літар.

БУДОВА ТЭКСТУ



З якіх частак складаецца тэкст?

13. Прачытайце тэкст.

Сябры

За горадам праводзіліся лыжныя спаборніцтвы. Лёгка імчаліся па лыжні хлопчыкі і дзяўчынкі.	Пачатак
Міця і Віця ішлі першымі. Раптам Віця пачуў трэск. За воблакам снежнага пылу знік Міця. Ён зламаў лыжу і зваліўся ў роў. Віця хутка з'ехаў па схіле да сябра. З цяжкасцю Віця з Міцем выбраліся з рова.	Асноўная частка
У спаборніцтвах перамог іншы хлопчык. Але ўсе лічылі, што Віця паступіў правільна.	Заключная частка, або канцоўка

На колькі частак падзелены гэты тэкст? Як называецца кожная частка тэксту?
Пра што гаворыцца ў пачатку тэксту?
Што змяшчае асноўная частка?
Аб чым расказваецца ў заключнай частцы?

Як будаваць тэкст

1. У пачатку тэксту трэба назваць тое, аб чым пойдзе гаворка далей.
2. У асноўнай частцы расказаць пра падзеі.
3. Тэкст трэба закончыць так, каб было зразумела, што ўжо ўсё сказана.

14. Прачытайце. Якая частка тэксту адсутнічае?

Усе рэчы ляжаць на сваіх месцах. Кнігі расстаўлены на кніжнай паліцы. Цацкі складзены ў скрынку. На падаконніку стаяць вазоны.
Я сам падтрымліваю парадак у пакоі.

Прыдумайце пачатак тэксту.



15. Прачытайце. Прыдумайце працяг апавядання.

На беразе лясной рэчкі на пні сядзела вавёрка. У лапках яна трымала яловую шышку і грызла яе. Раптам з лесу выскачыў вялікі сабака. ...



16. Прачытайце. Якая частка тэксту адсутнічае?

Лясныя дзіцяняты

Пасля вясенняга абуджэння прыроды наступае час лясных дзіцянят.

Старэйшыя за ўсіх — медзведзяняты. Яны нарадзіліся ў бярлозе зімой. Медзведзяняты любяць лазіць па дрэвах, хадзіць з мядзведзіцай на рэчку. Вось выскачылі на паляну зайчаняты. Каля нары разлягліся і грэюцца на сонейку рыжыя лісяняты.

...

Сустрэнеш маленькіх жыхароў лесу — не крыўдзі іх. Няхай ведаюць, што ў лес прыходзіў сябар.

Спішыце канцоўку тэксту.

17. Прачытайце тэкст. Прыдумайце да яго загаловак. Як звязаны сказы ў тэксце?

Вавёрка зрабіла сваю кладоўку ў дупле старога дрэва. Сюды яна склала арэхі і шышкі. Рыжая непаседа збірае і грыбы. Іх яна натыкае на абламаныя сучкі дрэў і сушыць на запас. Зімой звярок будзе скакаць па галінках і падсілкоўвацца сухімі грыбамі.

аква́рыум

18. Прачытайце. Устаўце словы, якія дапамогуць звязаць сказы ў тэксце. Тэкст запішыце.



Акварыум

Тата купіў мне акварыум.

... вельмі вялікі. На дне ... растуць водарасці. Я запусціў ... маленькіх рыбак — гупі і мечаносцаў. Мой кот Васька заўсёды сядзіць побач з ... і назірае за рыбкамі *(Паводле М. Скарахода)*.

Словы для даведкі: *акварыума, ён, акварыумам, туды.*



19. Прачытайце словы. Успомніце казку, якую можна расказаць з дапамогай гэтых слоў.

Лісіца, Гусак, злавіла, з'ем, дазволь патанцаваць, танцуй сабе, махаць крыламі, лісіца смяецца, узняўся і паляцеў, з разяўленым ротам.


Раскажыце казку.

20. Прачытайце тэкст. Назавіце яго тэму. Дайце тэксту загаловак.

Цяжка перажыць халодную зіму звярам і птушкам.

Галодны воўк шукае спажывы ў лясным гушчары. Асцярожныя зайцы робяць на снезе хітрыя петлі. Мышкуюць* лісіцы. Пахаваліся недзе птушкі. Толькі чырванагрудыя снегіры спакойна сядзяць на рабіне *(Паводле Я. Зазекі)*.

**Мышкуюць* — ловяць пад снегам мышэй.



Раскажыце, як вы дапамагаеце птушкам зімой.

21. Прачытайце тэкст. Як звязаны сказы ў тэксце? Якія словы дапамагаюць звязаць сказы?

Апельсінавае дрэва

Тата пачаставаў маленькую Наташу апельсінавай цукеркай. Дзяўчынка адразу хацела яе з'есці, але раптам перадумала. Яна пабегла ў сад і пасадзіла цукерку. Можа, з яе вырасце апельсінавае дрэва *(Паводле М. Панковай)*.

Перакажыце тэкст.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

22. Прачытайце. Вызначце, пад якім нумарам запісаны тэкст.

1. Дзяўчынка шые лялькам сукенкі. Лена палівае кветкі ў садзе. З настаўніцай Галінай Фёдараўнай мы ездзілі на экскурсію.

2. Розныя бываюць птушыныя гнёзды. Я зрабіў шпакоўню. Самае вялікае гняздо ў арла.

3. У Алёшы жыве сабака. Хлопчык даў яму клічку Гай. Гай спіць на ганку. Ён вартуе дом. Усе любяць разумнага сабаку.

Спішыце тэкст. Дайце яму загаловак.

23. Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак. Спішыце.

ма́йстар

Віця і Дзіма сябруюць. Пасля ўрокаў Дзіма майстраваў самалёт. Віця дапамагаў яму. Добры самалёт атрымаўся ў хлопчыкаў.


Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

24. Прачытайце тэкст. Прыдумайце загаловак. Вызначце пачатак тэксту, асноўную частку і заключную.


Усе кажуць, што ў Алёшкі залатыя рукі. Ён вельмі любіць майстраваць. Тата купіў яму інструменты.



Зімою Алёшка зрабіў кармушку для птушак. Кожны дзень да яе прылятаюць сініцы і вераб'і. Нават сарока іншы раз заглядвае.



Вясною трэба расаду вырошчваць. Алёшка знайшоў дошкі і зрабіў скрынкі. Дзіва што! Гэта ж прасцей простага.



Летам усе дзеці на веласіпедах катаюцца. А ў Алёшкі яго няма. Доўга не думаючы змайстраваў ён сабе самакат.

Вось такі ён, Алёшка. Што задумае, тое і зробіць.

Вусна перакажыце тэкст.



Давайце пазнаёмімся

25. Прачытайце, як адбывалася знаёмства хлопчыка з кіраўніком гуртка.

— Добры дзень! Мяне завуць Іван Сядун. Мне восем гадоў. Я вельмі люблю маляваць і хачу наведваць ваш гуртэк.

— Дзень добры! Я — Мікалай Іванавіч. Вельмі прыемна, будзем знаёмыя. Праходзь, не саромейся.

Якія ветлівыя словы гавораць людзі пры знаёмстве? Што паведамілі аб сабе хлопчык і кіраўнік гуртка?

26. Прачытайце словы, якія ўжываюць пры знаёмстве.

Вельмі прыемна.
Будзем знаёмыя.
Рады(а) знаёмству.
Прыемна пазнаёміцца.





27. Разыграйце з суседам па парце сцэнку знаёмства. Уявіце, што вы прыехалі ў аздараўленчы лагер (упершыню прыйшлі ў хакейную секцыю, запісаліся ў шахматны гурток). Вы можаце прыдумаць і іншую сітуацыю.

Не забывайце ўжываць ветлівыя словы!

28. Адкажыце на пытанні.

1. Як завуць твайго сябра (сяброўку)?
2. Ці даўно вы пазнаёміліся?
3. Што вы любіце рабіць разам?
4. Ці бываюць паміж вамі спрэчкі?
5. Хто першым прапануе мірыцца?



29. Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак.

Працавіты шустры вожык
Не шкадуе жвавых ножак.
Назбіраў грыбоў, арэхаў,
каб зімой была ўцеха.

Т. Мушынская

Спішыце. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць няпарныя цвёрдыя зычныя гукі.

30. Разгледзьце малюнак. Адкажыце на пытанні.



1. Хто прыйшоў у госці на свята да лясных жыхароў?
2. Што падарыў Дзед Мароз зайчыку?
3. Які падарунак атрымала лісічка?
4. Чым частуе Снягурачка птушак?
5. Што атрымаў лось?
6. Якія словы падзякі пачулі Дзед Мароз і Снягурачка ад лясных жыхароў?

Вусна складзіце тэкст.

Праверце сябе

1. Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму. Прыдумайце загаловак.

У нашым двары расце старая рабіна. Летам пад ёю любіць сядзець дзядуля. Увосень на дрэве прыгожа зіхацяць чырвоныя гронкі ягад. З надыходам зімы да рабіны прылятаюць снегіры. Яны любяць ласавацца сакавітымі ягадамі *(Паводле Р. Ігнаценкі)*.

Як звязаны сказы ў тэксце?

2. Вызначце часткі тэксту.

Сябры

Змітрок захварэў. Кожны дзень да яго прыходзілі Пеця і Сярожа. Хлопчыкі чыталі кніжкі, рыхтавалі хатнія заданні. Хораша на душы ад сяброўскай увагі!

Спішыце тэкст. Кожную частку пачынайце з чырвонага радка.



СКАЗ



Якія прыметы мае сказ?

31. Прачытайце. Колькі ў тэксце сказаў? Як вы даведаліся? Пра што гаворыцца ў кожным сказе?

Шэрыя хмары віснуць над зямлёю. Сыпле дробны снег. Каля хат вырастаюць белыя курганы́.



Сказ выражае закончаную думку.

32. Прачытайце. Складзіце з гэтых слоў прыказкі. Якія словы змяніліся?

Без, вучэнне, няма, уменне.
Без, цярпенне, няма, вучэнне.

33. Прачытайце. Пад якімі нумарамі запісаны сказы?

1. Маладыя вераб'і скачуць па дарожцы.
2. шэры на плоце верабей
3. шукаюць зярняткі
4. Вераб'і весела шчабечуць.

Запішыце сказы.

34. Прачытайце тэкст. Колькі ён мае частак?

Надыход зімы

Апусцелі палі. Надвор'е мяняецца. Радзей бываюць сонечныя дні. Усё часцей цяру́шыць дробны дождж.

У ямцы пад галлём заснуў на ўсю зіму вожык. Лёг у бярлог мядзведзь.


Ціха і сумна ў лесе *(Паводле В. Вольскага)*.

Выпішыце сказы пра звяроў.

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць парныя звонкія і глухія зычныя гукі.

35. Разгледзьце малюнкі. Прачытайце сказы. Пра каго ў іх гаворыцца?





... любіць малако. ... любіць траву.

Замест кропак устаўце патрэбныя словы. Запішыце сказы.

36. Прачытайце. Колькі тут сказаў? Успомніце, як афармляецца сказ на пісьме.

Сказы запішыце.

доктар лечыць людзей настаўнік вучыць дзяцей аграном вырошчвае хлеб

Словы ў сказе звязаны паміж сабой. Каб са слоў атрымаўся сказ, словы трэба змяняць.

37. Складзіце са слоў два сказы і запішыце іх. Памятайце пра правапіс ***ў***.

я, дрэва, на, убачыў, сініца
ці660ькала, сонейка, грэлася, на, яна, весела, і



38. Прачытайце. Змяніце словы так, каб яны былі звязаны паміж сабой і ўтваралі сказы.

дзеці, фізкультура, урок, любяць
раніцай, з, гімнастыка, робім, брат, мы

Запішыце сказы.

ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ Ў КАНЦЫ СКАЗАЎ



На што паказвае знак прыпынку ў канцы сказа?

39. Прачытайце сказы, у якіх змяшчаецца паведамленне. Які знак прыпынку стаіць у канцы гэтых сказаў?

На зямлю ціха апускаецца змрок*. У небе загараюцца яркія зоркі. Узыходзіць маладзенькі месячык. Начная цішыня ахутвае наваколле.

**Змрок* — цемра.

навако́лле

Запішыце сказы.

У канцы сказа, які змяшчае паведамленне, ставіцца кропка. Напрыклад: *У небе спявае жаваранак*.

Голас пад канец такога сказа паступова паніжаецца.

40. Прачытайце. Выдзяляйце голасам канец кожнага сказа.

Як вы пакажаце на пісьме пачатак і канец кожнага сказа?

узышло сонца прачнуліся гарады і вёскі людзі спяшаюцца на працу дзеці ідуць у школу

Запішыце сказы.

41. Разгледзьце малюнак. Вусна складзіце па ім тэкст.



Запішыце тэкст. Правільна аформіце сказы на пісьме.

наступіў зімовы вечар Маша робіць урокі брат Максім дапамагае ёй

42. Прачытайце. Колькі тут сказаў? Якія знакі прыпынку прапушчаны?

прыйшла зіма ціха ў лесе снег ухутаў дрэвы і кусты

Запішыце. Правільна аформіце сказы на пісьме. Падкрэсліце слова, у якім тры склады.

43. Прачытайце сказы, у якіх змяшчаюцца пытанні. Звярніце ўвагу, які знак прыпынку стаіць у канцы гэтых сказаў?

1. У якім класе ты вучышся?
2. Як завуць тваю настаўніцу?
3. Ці ёсць у цябе сябры?

Запішыце адказы на пытанні.

У канцы сказа, які змяшчае пытанне, ставіцца пытальнік.

44. Разгледзьце малюнак. Прачытайце пытанні. Выдзеленыя словы вымаўляйце з большай сілай голасу. Вусна адкажыце на пытанні.



1. **Хто** катаецца на лыжах?
2. **Што робіць** дзяўчынка?
3. **На чым** катаецца дзяўчынка?

Пры вымаўленні пытальнага сказа голас павышаецца на тым слове, на якое хацелі б атрымаць адказ.

Напрыклад: ***У якім** класе ты вучышся? Я вучуся **ў другім** класе.*

45. Прачытайце пытанні і адказы на іх. Выдзяляйце голасам тыя словы, у якіх заключаны пытанні і адказы на іх.

Дзе жыве вавёрка?
Вавёрка жыве ў лесе.

Дзе вавёрка робіць гняздо?
Гняздо вавёрка робіць у дупле дрэва.

Чым харчуецца вавёрка?
Вавёрка харчуецца арэхамі, насеннем з сасновых шышак, сушанымі грыбамі.

Спішыце першае пытанне і адказ на яго. Які знак стаіць у канцы пытальнага сказа?

46. Прачытайце ўрывак з казкі «Лісіца і сабакі». Дайце адказы на пытанні.

Якія знакі прыпынку неабходна паставіць у канцы сказаў?



Лісіца пытаецца:

— Вушкі, вушкі, што вы рабілі
— ...
— Ножкі, ножкі, што вы рабілі
— ...
— Вочкі, вочкі, што вы рабілі
— ...
— А ты, хвост, што рабіў
— ...

Спішыце пытанні. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў канцы сказаў.

47. Запішыце адказы на пытанні. Выкарыстайце подпісы да малюнкаў.





1. Якая птушка самая вялікая?
2. Якая птушка самая маленькая?

48. Прачытайце сказы, якія выражаюць загад або заклік. Які знак прыпынку стаіць у канцы гэтых сказаў?

Зара, ярчэй гары! Прачынайся, зямля!

Спішыце сказы. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць няпарныя цвёрдыя зычныя.

У канцы сказа, які вымаўляецца з моцным пачуццём, ставіцца клічнік: ***Да пабачэння, буслы! Да радаснай сустрэчы вясной!***

49. Прачытайце сказы беларускіх пісьменнікаў так, каб перадаць радасць, захапленне. Спішыце першы сказ.

1. Як слаўна, як хараша ўранку на ўзлессі вясновай парой!
2. Добра ў лузе ў час палудны! Лёгка там дыхнуць!

Прыдумайце сказ, у якім выразіце радасць.

50. Прачытайце. Як вымаўляецца кожны сказ? Якія знакі прыпынку тут патрэбны?

Рабочыя рукі

— Хто ўзвёў заводы і школы
— Рабочыя рукі
— Хто вырасціў багаты ўраджай
— Рабочыя рукі
— Хто пабудаваў касмічныя караблі
— Рабочыя рукі
— Слава людзям працы
— Слава рабочым рукам

Пры спісванні пастаўце ў канцы кожнага сказа патрэбны знак прыпынку.

51. Прачытайце сказы так, як падказваюць знакі прыпынку. У чым будзе розніца?

Добрая горка атрымалася.
Добрая горка атрымалася!
Добрая горка атрымалася?

Прыдумайце свой сказ па гэтым узоры.



52. Разгледзьце малюнак.



Складзіце па малюнку тэкст, каб у ім быў сказ-пытанне.

53. Прачытайце тэкст. Што выражае кожны сказ (паведамленне, пытанне, загад)? Якія знакі прыпынку трэба паставіць у канцы сказаў? Запішыце тэкст.

Задаюць пытанні дзеці
Ім цікава ўсё на свеце
Чаму сонейка пячэ
Адкуль рэчанька цячэ.
М. Валько

СЛОВА, ЯКОЕ АБАЗНАЧАЕ, ПРА КАГО АБО ПРА ШТО ГАВОРЫЦЦА Ў СКАЗЕ

54. Складзіце сказы па малюнках. Пра каго гаворыцца ў кожным сказе?





Сказ звычайна будуецца так, што ў ім пра каго-небудзь ці пра што-небудзь гаворыцца.

Слова, якое абазначае, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе, адказвае на пытанне х т о ? або ш т о? Гэтае слова падкрэсліваецца адной лініяй. Напрыклад: (Х т о?) *Хлопчык спявае.*

55. Прачытайце. Пра каго або пра што гаворыцца ў кожным сказе?

1. Наступіла зіма. 2. Дзеці ідуць гуляць у парк. 3. Яша ўзяў санкі. 4. Сябры катаюцца з горкі.

Спішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказах.

56. Замест кропак устаўце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказах.

(Х т о?) ... пайшлі на экскурсію.
Ярка свяціла (ш т о?) ... .

(Ш т о?) ... зацягнулі неба.
(Х т о?) ... заспяшаліся дамоў.

Словы для даведкі: *сябры, хмары, сонейка, дзеці.*

57. Са слоў складзіце сказы і запішыце.

1. Сонца, хмарку, за, зайшло.
2. Лёгкія, па, небе, плывуць, воблачкі.

Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў сказах.

58. Прачытайце загадкі. Пра каго (пра што) яны?

Што ляціць без крылаў?
Хто на сабе хату носіць?
Хто над намі дагары нагамі?



Пастаўце замест пытальных слоў словы-адгадкі і запішыце сказы. Ці зменіцца знак прыпынку ў канцы сказаў? Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго (пра што) гаворыцца ў сказах.



59. Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары. У кожным сказе падкрэсліце слова, якое адказвае на пытанне х т о? або ш т о?

1. Снег л..жыць на палях мяккім дыванам.
2. М..дзведзь спіць у б..рлагу́.
3. Вавёрка скача з галінкі на галінку.

СЛОВА, ЯКОЕ АБАЗНАЧАЕ, ШТО ГАВОРЫЦЦА АБ ПРАДМЕЦЕ ГУТАРКІ

60. Прачытайце сказ.

Вучань чытае.

хто? ←→ што робіць?

↓ вучань ↓ чытае

Пра каго гаворыцца ў сказе? Падкрэсліце гэта слова адной лініяй.

Што гаворыцца пра вучня? Падкрэсліце гэта слова дзвюма лініямі.

У сказе вызначаецца слова, якое абазначае тое, што гаворыцца аб прадмеце гутаркі. Яно адказвае на пытанне **што рабіў?** або **што робіць? што робяць? што зробяць?** Гэтае слова ў сказе падкрэсліваецца дзвюма лініямі.

(Хто?) *Школьнікі* (што зрабілі?) *наведалі* *музей*.

61. Прачытайце сказы. Назавіце словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказах і што гаворыцца.



1. Спіць сава ў дупле на пуховым крыле.



2. Па сцяжынцы мышанятка коціць спелае зярнятка.

3. Мышка ціхенька ў кутку зерне меле на муку.



Спішыце сказы. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

62. Прачытайце. Пра што гаворыцца ў кожным сказе? Што аб гэтым гаворыцца?

1. Зелянее рунь на палях шырокіх.
2. Самалёт ляціць над вёскай.
3. Нізка над зямлёю сцелецца туман.

Спішыце. Падкрэсліце ў кожным сказе слова, якое адказвае на пытанне ш т о?, адной лініяй, а на пытанне ш т о р о б і ц ь? — дзвюма.

63. Прачытайце сказы. Словы ў дужках змяніце, як патрабуе сэнс. Якія літары трэба пісаць у канцы змененых слоў? Чаму?

(Маразы) скаваў раку. *(Снягі)* ухутаў зямлю. Але дзяцей не пужае *(халады)*.

Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў сказах і што аб гэтым гаворыцца.

64. Прачытайце, устаўляючы патрэбныя словы.

Галодны воўк … па лесе.
… палюе на мышэй.
Дзік … жалуды.
… дзяўбе яловыя шышкі.
Вавёрка … арэхі.

Для даведкі: *ліса, збірае, блукае, грызе, дзяцел.*

Запішыце, устаўляючы прапушчаныя словы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказах і што гаворыцца.



65. Дапоўніце сказы словамі, якія адказваюць на пытанне ш т о р о б я ц ь?

Ры**б**кі … у акварыуме.
Пту**ш**кі … .
Дзеці … цікавую казку.

Запішыце сказы. Падкрэсліце ў кожным сказе слова, якое адказвае на пытанне х т о?, адной лініяй, а на пытанне ш т о р о б я ц ь? — дзвюма.

Да слоў з выдзеленымі літарамі падбярыце праверачныя.

СУВЯЗЬ СЛОЎ У СКАЗЕ



Як вызначыць сувязь слоў у сказе?

66. Прачытайце.

Мяккі снег лятае пух.

Чаму гэтыя словы нельга назваць сказам?
Складзіце сказ. Пастаўце пытанне да слова *пухам*.



Словы ў сказе звязаны па сэнсе.

67. Прачытайце.

Веснавое сонца **росы** падбірае.

Вылецела **ў поле** пчолка **залатая.**

Вызначце сувязь слоў у сказах.
Запішыце сказы разам з пытаннямі да выдзеленых слоў.

У з о р. (Я к о е?) *Веснавое сонца* (ш т о?) *росы падбірае*.

Сувязь слоў у сказе вызначаецца па пытаннях.

68. Змяніце словы ў дужках, як патрабуе сэнс, і запішыце сказы. Да змененых слоў пастаўце пытанні.

1. З *(поўнач)* дзьмуць *(халодны)* вятры.
2. Над *(зямля)* навіслі *(снегавы)* хмары.

69. Прачытайце. Колькі тут сказаў? Як вы разважалі, калі дзялілі тэкст на сказы?

У другім сказе вызначце сувязь слоў.

зіма толькі пачалася **лёгкі** марозік пакрыў лужыны тонкім **лядком** сняжынкі апускаюцца на зямлю ветрык кружыць іх у белым танцы

Запішыце сказы.

У выдзеленых словах падкрэсліце літары, напісанне якіх трэба правяраць.

Якая тэма гэтага тэксту?

70. Складзіце з гэтых слоў сказы. Растлумачце іх сэнс.

1. **кніга, пра, усё, расказваць**
2. **розум, мацнейшы, за, сіла**

Запішыце сказы.

Складзіце адзін-два сказы пра сваю школу і запішыце іх.



71. Спішыце. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго (пра што) гаворыцца ў сказах і што гаворыцца. Вусна пастаўце пытанні да выдзеленых слоў.

1. Віця злавіў **мяч.** 2. Вучань нясе **рукзак** з кнігамі. 3. **Тонкая** сцяблінка трымае **важкі колас.**

72. Прачытайце. Што абазначаюць выдзеленыя словы? Замест пытанняў устаўце словы. Запішыце сказы.

(Я к і?) … **мароз шчыпле** (ш т о?) … . **Дрэвы пакрыліся** (ч ы м?) … .

Словы для даведкі: *моцны, інеем, твар.*

73. Дапоўніце сказы па пытаннях.

Дзеці ўсяго свету хочуць (ч а г о?) ... . Хай заўжды над (ч ы м?) ... свеціць (я к о е?) ... сонца!

Словы для даведкі: *яснае, міру, зямлёй.*

74. Складзіце са слоў сказы і запішыце. Вусна вызначце ў іх сувязь слоў (па пытаннях).

1. полі, чыстым, у, вецер, гуляе
2. бягуць, моры, сінім, у, хвалі
3. у, хмары, небе, снегавыя, плывуць

Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў сказах і што аб гэтым гаворыцца.



75. Са спалучэнняў слоў складзіце сказы.

стракаты дзяцел	звіняць у кустах
даўганогі бусел	стукае па дрэве
шэрая зязюля	ходзіць па балоце
вясёлыя сініцы	кукуе ў лесе

Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказах і што гаворыцца.

Праверце сябе

1. Прачытайце. Пад якімі нумарамі запісаны сказы, а пад якімі — набор слоў?

1. З, выраю, вяртацца, ластаўкі.
2. Ластаўкі вярнуліся з выраю.
3. Ён, хацець, вучыцца.
4. Я старанна вучуся.

2. Спішыце сказы, пастаўце ў канцы патрэбныя знакі прыпынку.

1. Які прыгожы дзяцел
2. Галоўка ў яго чырвоная, а спінка чорная
3. На крыльцах белыя плямкі і палоскі
4. А вы бачылі дзятла

3. Прачытайце сказы. Вызначце словы, якія абазначаюць, пра каго (пра што) гаворыцца ў сказах і што пра гэта гаворыцца.

1. У небе звініць жаваранак.
2. Дзеці спявалі вясёлую песеньку.
3. Да сасны прыхілілася маладая бярозка.



СЛОВА



Для чаго патрэбны словы?

76. Прачытайце.

Тэкст

У бабулі быў сабачка. Жвавы, з вясёлымі вочкамі, чорненькі такі. **Бабуля звала яго Жучком.**

Аднойчы бабуля занядужала. «Хуткая дапамога» забрала яе ў бальніцу. Жучок ляжаў каля ганка. Ён разумеў, што трэба вартаваць хату.

Сказ Бабуля звала яго Жучком.

Слова Жучок

Адкажыце на пытанні.

З чаго складаецца тэкст?
З чаго складаюцца сказы?

77. Прачытайце. Як вы разумееце выказванні знакамітых пісьменнікаў?

...Для ўсяго, што існуе ў прыродзе, у мове ёсць вялікае мноства добрых слоў і назваў *(К. Ушынскі)*.

Слова — гэта адзенне ўсіх думак *(Максім Горкі)*.

78. Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Цёплае слова і ў мароз **сагрэе.**
Добрае слова чалавеку, як **дождж** у **спёку.**
Ласкавае слова і **звера** **ў**лагодзіць.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар. Запішыце адзін сказ (на выбар), падзяляючы выдзеленыя словы на склады.

Назавіце словы, у якіх літар больш, чым гукаў.

79. Прачытайце.

Мы жывём у цудоўнай краіне.

Назавіце словы, з якіх складаецца сказ. Пастаўце да іх пытанні. Як пішуцца словы ў сказе: асобна ці разам?

80. Прачытайце.

Сняжынкі, ручаі, гурбы, шпакі, мяцеліца, капяжы, мароз, вясёлка, падснежнік, сонца, вясна.

Што вы ўяўляеце, калі чытаеце кожнае слова?
Якія словы можна ўключыць у тэкст пра вясну? Растлумачце свой выбар. Выпішыце гэтыя словы. Складзіце з імі сказы.



81. Спішыце тэкст. Падрыхтуйцеся растлумачыць правапіс выдзеленых літар.

Нізка віснуць над зямлёю
хмары снегавыя.
Свішча вецер за сцяною,
у коміне вые.

Я. Колас

ЗНАЧЭННЕ СЛОВА



Што галоўнае ў слове?
Дзе даведацца пра значэнне незразумелага, невядомага слова?

82. Прачытайце словы. Што абазначае кожнае з гэтых слоў?

Агурок — ..., ластаўка — ..., талерка — ..., яблык — ..., шчупак — ..., шафа — ..., чарніцы — ..., карова — ..., паліто — ..., ружа — ..., воўк — ..., аўтобус — ... .

Словы для даведкі: *ягады, агародніна, звер, посуд, вопратка, транспарт, садавіна, кветка, мэбля, жывёліна, птушка, рыба.*



Значэнне слова — гэта яго сэнс, тое, што слова абазначае.

83. Запішыце адным словам.

1. Прамежак часу, роўны 12 месяцам.
2. Прыём ежы, звычайна ў сярэдзіне дня.


3. Атмасферныя ападкі ў выглядзе ледзяных шарыкаў.

4. Буйны звер, які зімой спіць у берлагуў, любіць мёд.

Ці правільна вы абазначылі літарамі апошнія гукі ў словах? Складзіце сказ з адным словам (на выбар).

Галоўнае ў слове — гэта яго значэнне. Значэнні слоў раскрываюцца ў тлумачальным слоўніку.

84. Прачытайце словы ў слоўніку на с. 118 на тэму «Адзенне і абутак». Выпішыце словы, значэння якіх не ведаеце. Даведайцеся іх значэнне.



85. Прачытайце. Якое значэнне мае слова *хлеб* у сказах?

1. У мінулым годзе сабралі багаты ўраджай хлеба.
2. У дзедавай хаце прыемна пахла цёплым хлебам.

Для даведкі.

Хлеб.

1. *Прадукт харчавання, які выпякаецца з мукі.*
2. *Збожжа, абмалочанае зерне.*

86. Разгледзьце малюнкі, прачытайце словы. Што абазначае кожнае з іх?



шарык Шарык



Галінка галінка

Ад значэння слова часта залежыць яго напісанне.

87. Выберыце патрэбныя словы і запішыце сказы.

1. Маленькі *(Шарык, шарык)* добра вартуе хату.
2. Сяброўка *(Галінка, галінка)* прынесла мне *(Галінку, галінку)* вярбы.

88. Прачытайце сказы. Растлумачце значэнні выдзеленых слоў.

1. Паляцелі ў вырай **аўсянкі** і ластаўкі.
2. Мама купіла ў магазіне кілаграм **аўсянкі.**



89. Прачытайце. Падрыхтуйцеся патлумачыць значэнні выдзеленых слоў.


Мама, тата, сястра, бабуля, дзядуля, **пасажыр, чытач, бібліятэка.**

Запішыце словы ў алфавітным парадку.



Колькі значэнняў можа мець слова?

90. Разгледзьце малюнкі. Якія значэнні мае слова *ручка*?



Слова можа мець адно або некалькі значэнняў.

91. Прачытайце. Якія значэнні мае слова *мухалоўка*?

Дзве мухалоўкі


1. Мухалоўка меншая за вераб'я. Мухалоўкі ловяць мух, матылёў і вусеняў. Яны жывуць у парках, садах, лясах. Мухалоўка — гэта … .

2. У мухалоўкі ядавітыя лісты. Лісты ловяць насякомае, як пастка. Мухалоўка — гэта … .

Запішыце тэкст пра адну з мухаловак (на выбар), устаўце патрэбнае слова.

92. Прачытайце сказы.

1. Каля школы вучні пасадзілі рад вішань.
2. Мама зварыла смачнае варэнне з вішань.



Вызначце, у якім сказе слова *вішні* ўжыта ў значэнні *«вішнёвае дрэва»*, а ў якім — у значэнні *«плады вішнёвага дрэва»*?

93. Складзіце сказы са спалучэннямі слоў.

Сярэбраны іней, **сярэбраны** пярсцёнак; **дарагі** тавар, **дарагі** чалавек.

Што абазначаюць выдзеленыя словы?

Для даведкі.
Сярэбраны.
1. *Колеру серабра.*
2. *Зроблены з серабра.*

Дарагі.
1. *Мае высокую цану.*
2. *Мілы, любімы.*



94. Разгледзьце малюнкі. Што можа абазначаць слова *іголка*?









Складзіце і запішыце сказы са словам *іголка* ў розных значэннях.

95. Разгледзьце малюнкі. Надпісы пад імі абазначаюць адно і тое ж ці рознае?





гіпапатам

бегемот





імчыцца

бяжыць

Розныя па гучанні словы могуць быць аднолькавымі або блізкімі па значэнні. Напрыклад: *ісці, крочыць*.

96. Прачытайце. Знайдзіце ў тэксце словы, блізкія па значэнні. Выпішыце іх.

калекты́ў

Хто мы такія?



Маша адказвае:
— Мы школьнікі.
Пеця дадае:
— Мы вучні.
Віця кажа:
— Мы дзеці.
— Мы яшчэ і аднакласнікі, — нагадвае Юра.

— Усе вы — сябры, — адзначае настаўніца. — А яшчэ можна сказаць, што вы — калектыў*.

**Калекты́ў* — група людзей, аб'яднаных агульнай працай, інтарэсамі.

97. Прачытайце словы. Знайдзіце сярод іх блізкія па значэнні. Запішыце па ўзоры.

Пілот, шэрань, холад, смеласць, адвага, сцюжа, іней, лётчык.

У з о р. *Пілот — лётчык.*



98. Прачытайце тэкст. Назавіце словы, блізкія па значэнні. Раскажыце, як трэба пераходзіць вуліцу.



Імчацца па вуліцах сталіцы машыны, бягуць па рэйках трамваі, коцяцца тралейбусы. Але Пеця іх не баіцца. Чаго іх баяцца, калі не парушаеш правілаў вулічнага руху?

99. Прачытайце тэкст. Якімі словамі перадаецца маляўнічасць прыроды?

Растлумачце значэнне выдзеленых слоў.

Стройныя сосны і кучаравыя елкі **абдымаюць** поле. Пазалочаныя бярозкі дапамагаюць сонцу праганяць з лесу змрок. **Гарaць** чырвоныя гронкі рабіны *(Паводле У. Шахайца)*.

Спішыце. Падкрэсліце літару, якая не абазначае гука.

100. Дакажыце, што запісаныя ніжэй словы блізкія па значэнні. Выкарыстайце матэрыял для даведкі.

Мяцеліца, завіруха, завея;
алфавіт, азбука;
казюлька, казяўка;
асілак, волат.

Для даведкі: ***Моцны вецер са снегам.***
Пералік літар у пэўным парадку.
Усякае дробнае насякомае.
Герой народных казак, надзелены незвычайнай сілай.



101. Прачытайце. Замяніце выдзеленае слова блізкімі па значэнні.

Чалавек **ідзе.** Тралейбус **ідзе.** Вясна **ідзе.** Дождж **ідзе.** Гадзіннік **ідзе.**

Запішыце новыя сказы.

Словы для даведкі: ***наступае, паказвае час, лье, крочыць, едзе.***

102. Разгледзьце малюнак. Закончыце сказы.

Міша высокі, а Коля ... .
У Мішы вялікі цяжкі рукзак, а ў Колі ... .
У Мішы светлыя валасы, а ў Колі ... .



Якімі словамі вы дапоўнілі сказы: блізкімі па значэнні ці супрацьлеглымі?

Словы бываюць супрацьлеглымі па значэнні. Напрыклад: *чорны — белы*.

103. Падбярыце супрацьлеглыя па значэнні словы.

ноч — ...
раніца — ...
спёка — ...
смех — ...

ранні — ...
гучны — ...
шырокі — ...
блізкі — ...

Запішыце словы парамі.

104. Да выдзеленых слоў левага слупка падбярыце супрацьлеглыя па значэнні словы з правага слупка.

У з о р. *Стары сад — малады сад.*

старая хата	складанае заданне
свежы хлеб	вільготнае паветра
сухое паветра	новая хата
лёгкае заданне	чэрствы хлеб

Запішыце. Падкрэсліце словы, супрацьлеглыя па значэнні.



105. Прачытайце прыказкі.

1. Вучэнне — све**т**, а н**е**вучэнне — цемра.
2. За в**я**лікім пагонішся — і малое згубіш.
3. Менш гавары, а бол**ь**ш рабі.

Спішыце прыказкі. Падкрэсліце словы з супрацьлеглым значэннем. Падрыхтуйцеся растлумачыць правапіс выдзеленых літар.

СЛОВЫ — НАЗВЫ ПРАДМЕТАЎ



Чаму да слоў, якія абазначаюць прадметы, ставяцца розныя пытанні: х т о? або ш т о?

106. Разгледзьце малюнак. Назавіце, хто жыве ў лесе, што расце ў лесе.



Запішыце па ўзоры.

У з о р. (Х т о?) *Дзікі*, ...
(Ш т о?) *Бярозы*, ...

Словы, якія абазначаюць прадметы, адказваюць на пытанні х т о? ш т о? Напрыклад: (х т о?) *дзядзька, чалавек, птушка;* (ш т о?) *дрэва, мост, акуляры.*



107. Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак. Назавіце ў кожным сказе словы, якія абазначаюць прадметы. На якія пытанні яны адказваюць?

Весела свеціць сонейка. **Заліваецца** школьны званок. Дзеці са смехам **высыпалі** на двор. Хлопчыкі з захапленнем ганяюць на стадыёне мяч. Дзяўчынкі скачуць цераз скакалку.

стадыён

Да выдзеленых слоў падбярыце блізкія ім па значэнні.

Да слоў, якія абазначаюць жывых істот — людзей, жывёл, — ставіцца пытанне х т о?: *бабуля, конь, салавей, муха.*

Да слоў — назваў нежывых прадметаў ставіцца пытанне ш т о?: *горад, дом, вада, сонца.*

108. Спішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія адказваюць на пытанне х т о?

У пушчы не моўкне птушыная песня. Свішча шпак, стракоча сарока, кукуе зязюля, клякоча бусел.

109. Выпішыце спачатку словы, якія адказваюць на пытанне х т о? Пасля выпішыце словы, якія адказваюць на пытанне ш т о?

Грыбнік, звярок, бульба, стол, сястра, песня, Маша, майстар, цішыня, дзверы, свята, жыта, пчала, лясны, сонечны.

Якія словы вы не выпісалі? Чаму?

110. Прачытайце словы. Пастаўце да іх пытанні. Што абазначае кожнае слова?

Конь, карась, муха, верабей, жаваранак, будаўнік, карп, артыст, авечка, сом, камар, мядзведзь, каза, інжынер, бусел, кот, сабака, плотка, шпак, вожык, зязюля.

Вызначце, да якіх груп адносяцца словы.

Людзі: дзеці, доктар, ...
Свойская і дзікая жывёла: карова, ...
Птушкі: певень, ластаўка, ...
Рыбы: шчупак, ...
Насякомыя: жук, ...

Запішыце словы адной групы.

111. Выпішыце спачатку словы, якія абазначаюць адзін прадмет, а потым — словы, якія абазначаюць многа прадметаў.

Сад, садоўнікі, будынкі, будаўнік, школа, школьнікі, школьніца, шпакі, шпакоўня, мора, маракі.


На якія пытанні адказваюць гэтыя словы?

112. Прачытайце. Што ўбачылі школьнікі ў Мінску?

тэа́тр

Школьнікі прыехалі на экскурсію ў Мінск. Дзеці з цікавасцю разглядалі вялікія прыгожыя будынкі, станцыі метро. Асабліва ўразіў іх будынак Нацыянальнай бібліятэкі. У тэатры вучні паглядзелі лялечны спектакль.

спекта́кль



Спішыце тэкст, падкрэсліце словы, якія адказваюць на пытанне ш т о?



113. Прачытайце. Выпішыце з тэксту назвы птушак. На якое пытанне адказваюць гэтыя словы?

На двары прыгравае ласкавае сонейка. У небе звонка спявае жаваранак. Пад страхой дружна шчабечуць ластаўкі. Вераб'і ў цёплым пяску купаюцца. Высока ў сінім небе распластаў крылы каршун. Ён сочыць пільным вокам за куранятамі.

Паводле М. Даніленкі

НАПІСАННЕ СЛОЎ З ВЯЛІКАЙ ЛІТАРЫ



Якія словы пішуцца з вялікай літары?

114. Прачытайце.

Ідуць тры хлопчыкі. Нехта паклікаў:
— Хлопчык!
Усе трое азірнуліся.

Чаму азірнуліся ўсе хлопчыкі?
Для чаго людзям даюцца імёны?

115. Прачытайце. Вызначце імёны, імёны па бацьку, прозвішчы.

Хлопчык Коля, дзяўчынка Таня, сяброўка Галя, вучань Бадрусёў Антон, настаўніца Марыя Паўлаўна.

Імёны, імёны па бацьку і прозвішчы пішуцца з вялікай літары.

116. Прачытайце. Што абазначаюць выдзеленыя словы?

Іван **Іванавіч,** Лідзія **Фёдараўна,** Вольга **Ігараўна,** Мікалай **Георгіевіч.**

Здагадайцеся, як завуць бацькоў гэтых людзей.
Спытайцеся ў суседа па парце імя яго бацькі. Цяпер назавіце свайго таварыша па імені і імені па бацьку.

117. Запішыце сказы, устаўце імя і прозвішча.

У Светы *(прозвішча)* ёсць брацік *(імя)*.
Дзіма чытае вершы *(імя, прозвішча аўтара)*.

118. Прачытайце тэкст. Назавіце словы, якія пішуцца з вялікай літары.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

Спартыўныя спаборніцтвы

На стадыёне сабралася шмат людзей. Там праходзілі спартыўныя спаборніцтвы. Галоўным суддзёй быў настаўнік Валерый Пятровіч. Першае месца па бегу заняла другакласніца Васіліна. Яе сяброўка Святлана далей за ўсіх скочыла ў даўжыню. Скачкі ў вышыню выйграў наш аднакласнік Алег. Усе пераможцы атрымалі шакаладныя медалі *(Паводле В. Гурскага)*.

Выпішыце імёны, імёны па бацьку.

выйграць



119. Дапішыце сказы.

Маё прозвішча, імя, імя па бацьку … … … . Майго тату завуць … … . Маю маму завуць … … .

Падрыхтуйцеся растлумачыць напісанне слоў з вялікай літары.

120. Прачытайце тэкст. Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах.

Васіль Іванавіч і Тамара Мікалаеўна працуюць у заапарку. Раніцай ветэрынары абходзяць усіх жывёл. М**я**д**з**ведзь Таптыгін задаволены. Яму далі цукру. Лісяняці Р**ы**ж**ы**ку таксама хочацца гасцінца. Дагл**я**даць зв**я**роў дапамагаюць Коля Голуб і Маша Сініцына.



Выпішыце з тэксту словы па групах.

Імёны: ..., ..., ..., ...
Імёны па бацьку: ..., ...
Прозвішчы: ..., ...
Клічкі: ..., ...

Клічкі жывёлы пішуцца з вялікай літары: *сабака Жук, карова Ночка.*

121. Спішыце сказ, падкрэсліце вялікую літару ў клічках жывёлы.

У нашага суседа Віктара Пятровіча ёсць сабака Палкан і кот Маркіз.

122. Прачытайце. Дапоўніце сказы клічкамі жывёлы.

Смятану любіць кот ... .
Грызе костку сабака ... .
У нас гадуецца цялушка ... .
На лузе пасецца конь ... .

Словы для даведкі: *(М/м)урлыка, (Ш/ш)арык, (Л/л)ыска, (О/о)рлік.*

Запішыце сказы. Правільна пішыце клічкі жывёлы.

123. Спішыце, устаўляючы патрэбную літару.

Налавіў унучак (К/к)..арпаў акунёў, язёў і (К/к)..арпаў *(У. Мацвеенка).*

124. Разгледзьце малюнкі. Дайце клічкі сабаку, каню, курыцы.





Складзіце і запішыце сказы, выкарыстайце прапанаваныя словы.

Словы для даведкі: ***Пяструшка, Орлік, Рэкс, вартуе дом, імчыцца як вецер, знесла яечка.***



125. Прачытайце. Успомніце казку і падрыхтуйцеся расказаць яе.

Жылі ў адным двары курачка Раба, гусак Шыпун і індык Балбатун...

Запішыце назвы свойскіх птушак і іх клічкі.

126. Прачытайце. Гэта тэкст ці асобныя сказы?

Прыгожая і ўтульная Беларусь! Раскінуліся на рацэ Прыпяць гарады Пінск,

Тураў, Петрыкаў, Мазыр. Стаяць на беразе Дзвіны старажытныя Полацк і Віцебск.

Мне ўсюды хацелася б пабываць (*Паводле Я. Сіпакова*).

Спішыце. Падкрэсліце назвы гарадоў, рэк.



Назвы краін, гарадоў, вёсак, вуліц, рэк, азёр пішуцца з вялікай літары: ***горад Мінск, вёска Вязынка, вуліца Арлоўская, рака Нёман, возера Нарач.***



127. Адкажыце на пытанні пісьмова.

Як называецца наша краіна?
У якім горадзе ці вёсцы ты жывеш?
На якой вуліцы знаходзіцца твой дом?

128. Спішыце. Растлумачце напісанне вялікай літары.

Наша сталіца

Мінск — сталіца Рэспублікі Беларусь. На плошчы Незалежнасці знаходзіцца Дом урада.

Галоўная вуліца Мінска — праспект Незалежнасці.

У Мінску ёсць падземная чыгунка — метро.

метро́







129. Прачытайце назвы беларускіх рэк.

Прыпяць, Ясельда, Пціч, Арэса, Дняпро, Свіслач, Вілія, Бярэзіна, Шчара, Сож.

Запішыце словы ў алфавітным парадку.

130. Прачытайце. Растлумачце напісанне выдзеленых літар. Падрыхтуйцеся запісаць тэкст пад дыктоўку.

У *(К/к)*ацярыны *(П/п)*аўлаўны ёсць унукі. *(М/м)*іша і *(В/в)*іця часта навед-

ваюць бабулю. Яны прыносяць ёй хлеб і малако. Бабуля частуе ўнукаў чаем з пернікамі.

Знайдзіце ў тэксце імёны і імёны па бацьку, падкрэсліце іх першыя літары.

Прыдумайце загаловак да тэксту.

СЛОВЫ — НАЗВЫ ПРЫМЕТ ПРАДМЕТАЎ



На якія пытанні адказваюць словы, што абазначаюць прыметы прадметаў?

131. Прачытайце. Назавіце з тэксту словы, якія абазначаюць прыметы яблыка.



Вожык намаляваў яблык і папрасіў сяброў назваць яго прыметы.

— Чырвоны! — крыкнуў Заяц.

— Смачны, — адзначыў Мядзведзь.

— Круглы, вялікі, — хітра ўсміхнулася Ліса.

Заяц назваў прымету па колеры. Мядзведзь ведае яблык на смак. А Ліса ўбачыла форму і памер яблыка.

Запішыце прыметы яблыка.

Яблык (я к і?) ..., ..., ..., ...

Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў, адказваюць на пытанні я к і? (я к а я? я к о е? я к і я?), ч ы й? (ч ы я? ч ы ё? ч ы е?): *салодкі (мёд), маленькая (вёсачка), разумнае (дзіця), высокія (горы), бабуліны (акуляры).*

132. Прачытайце. Прыдумайце словы, якія падыходзяць па сэнсе.

У з о р. *Ліса* (я к а я?) *рыжая, хітрая.*

Воўк (я к і?) ..., ...
Заяц (я к і?) ..., ...
Вавёрка (я к а я?) ..., ...

Запішыце па ўзоры. Падкрэсліце словы — назвы прымет прадметаў хвалістай лініяй.



133. Вусна складзіце некалькі сказаў пра любога звера. Дайце загаловак свайму тэксту. Якія назвы прымет прадметаў вы выкарысталі?

цвёрды

134. Прачытайце. Назавіце словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў. На якія пытанні яны адказваюць?

Духмяны хлеб, яблыневы сад, цёмныя ночы, сельская школа, цвёрдае слова.

135. Прачытайце назвы прадметаў. Параўнайце іх па адной прымеце.

Па смаку. Цукар (я к і?) салодкі, а лімон ... .

Па колеры. Мел (я к і?) белы, а вугаль ... .

Па велічыні. Каршун (я к і?) вялікі, а верабей ... .

Па шырыні. Сцежка (я к а я?) вузкая, а дарога ... .

Запішыце, устаўце словы, якія падыходзяць па сэнсе.

136. Прачытайце загадкі і адгадайце іх.



1. Хто зялёнымі вачамі
Грозна бліскае начамі?
Мае пухленькія лапкі,
Мае кіпцікі-царапкі?
Спінку пругка выгінае,
Страх на мышак наганяе?

У. Мацвеенка



2. Па дарожцы скок ды
скок чорны хвост і белы бок.

Р. Бохан

Выпішыце словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў.

137. Прачытайце словы. На якія пытанні яны адказваюць? Прымету аднаго ці некалькіх прадметаў абазначаюць?

Новы, высокая, блакітнае, далёкі, моцная, зоркае, цудоўны, найлепшы.

Змяніце словы так, каб яны абазначалі прыметы некалькіх прадметаў. Якое пытанне вам дапаможа?

138. Прачытайце. Знайдзіце назвы прадметаў і іх прымет. Пастаўце да іх пытанні.

Васільковы бант

Падзьмуў моцны вецер. Ён сарваў з Кацінай галавы вялікі сіні бант.

«Дзе я яго знайду сярод сініх васількоў?» — падумала Каця.



Дапамог верны сябар Рэкс. Ён хутка знайшоў васільковы бант.

Паводле Л. Арабей

Спішыце. Падкрэсліце назвы прадметаў прамой лініяй, а назвы іх прымет — хвалістай.

139. Прачытайце назвы прымет. Падбярыце да іх назвы прадметаў.

З..лёная ..., добрае ..., маленькі ..., невялікае ..., ласкавая ..., сало..кі ..., сіні ..., баязлівы ..., ні..кая ... .

Запішыце спалучэнні слоў, устаўце прапушчаныя літары.

140. Прачытайце. У якім сказе думка выказана больш поўна? Чаму? Растлумачце правапіс слоў з мяккім знакам.

1. Звініць званок.
2. Звініць школьны званок.
3. Звонка звініць школьны званок.

141. Прачытайце прыказку і запішыце яе. Да слова *ласкавы* падбярыце словы, блізкія па значэнні.

Ла́скавым словам можна і камень расплавіць.

142. Прачытайце. Назавіце словы, якія адказваюць на пытанні я к і? я к а я? я к о е? Падбярыце супрацьлеглыя па значэнні словы.

Кавун (я к і?) вялікі, а яблык … .
Камень (я к і?) цвёрды, а пух … .
Дрэва (я к о е?) высокае, а куст … .
Лета (я к о е?) спякотнае, а зіма … .

Словы для даведкі: *мяккі, нізкі, малы, сцюдзёная.*

143. У залежнасці ад таго, якія прыметы прадметаў выкарыстаць, можна стварыць розныя карціны. Паспрабуйце гэта зрабіць.

Сёння ... ... дзень. Неба ..., ... Ад гэтага і настрой ... .

Для даведкі: *ветраны, пахмурны, шэрае, нізкае, невясёлы.*

Сёння ... ... дзень. Неба ..., ... Ад гэтага і настрой ... .

Для даведкі: *цёплы, ясны, высокае, блакітнае, радасны.*

Запішыце адзін з тэкстаў. Прыдумайце да яго загаловак.

дзве́ры

144. Падбярыце назвы прымет прадметаў. Запішыце. У дужках пастаўце пытанні да слоў — назваў прымет прадметаў.

Стол (я к і?) ...	ільняны́
Абрус ...	драўля́ны
Міска ...	дубо́выя
Слоік ...	гліня́ная
Дзверы ...	шкляны́

145. Прачытайце. Падрыхтуйцеся пераказаць размову Дуба з Чаротам.

Дуб і Чарот

Чарот пытае ў Дуба:

— Чаму ты такі стары і тоўсты?

— Мне ўжо больш за сто гадоў, — адказвае Дуб.

— А чаму ты такі дужы?

— Каб перамагчы ўсе цяжкасці, патрэбна вялікая сіла *(Паводле Я. Коласа)*.

Запішыце прыметы дуба.

Дуб (я к і?) ... .



СЛОВЫ — НАЗВЫ ДЗЕЯННЯЎ ПРАДМЕТАЎ



На якія пытанні адказваюць словы, што абазначаюць дзеянні прадметаў?

146. Прачытайце. Якія з гэтых слоў называюць прадметы, якія — прыметы прадметаў, а якія — дзеянні прадметаў? Якія пытанні вы паставіце да слоў трэцяга слупка?

духмяны	сонца	ляцяць
ранняя	бэз	свеціць
яркае	птушкі	наступіла
пералётныя	вясна	цвіце

Складзіце з гэтых слоў сказы.

147. Прачытайце сказ.



Дзеці пускаюць караблікі.

Якое слова ў сказе адказвае на пытанне ш т о   р о б я ц ь?

Што называе слова *пускаюць*: прадмет, дзеянне прадмета ці прымету прадмета?

148. Прачытайце. Назавіце словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў. На якія пытанні яны адказваюць?

Дрэва расце. Дождж ідзе. Сонца свеціць. Вецер дзьме. Хмара плыве.

Спішыце. Падкрэсліце словы — назвы дзеянняў прадметаў.

> Словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў, адказваюць на пытанні што рабіць? што зрабіць? (што раблю? што робіш? што робіць? што робяць? і інш.): *пісаць, напісаць, пішу*.

149. Разгледзьце малюнкі. Якія дзеянні выконваюць людзі?









Запішыце па ўзоры.

У з о р. *Касец косіць.*

150. Прачытайце назвы прадметаў. Падбярыце да іх словы, якія абазначаюць рух, перамяшчэнне.

карабель …	скача
хлопчык …	ідзе
заяц …	бяжыць
птушка …	ляціць
аўтамабіль …	паўзе
жаба …	падаюць
змяя …	плыве
сняжынкі …	імчыцца

Запішыце па ўзоры.

У з о р. *Чалавек ідзе.*

151. Прачытайце. Падбярыце словы, якія абазначаюць назвы дзеянняў прадметаў.

Вова ... посуд.	шые
Тата ... дровы.	падмятае
Вера ... падлогу.	коле
Бабуля ... кветкі.	рамантуе
Дзядуля ... абутак.	палівае
Мама ... сукенку.	мые

Запішыце сказы. Словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў, падкрэсліце дзвюма лініямі.

152. Разгледзьце малюнкі.





Дайце дзецям імёны. Па кожным малюнку складзіце сказ, каб у ім былі словы — назвы прадметаў, прымет і дзеянняў прадметаў.

153. Прачытайце словы — назвы дзеянняў. Якія прадметы могуць выконваць гэтыя дзеянні?

... прыгравае. ... ажывае. ... паяўляюцца. ... зелянеюць. ... квітнеюць.

Словы для даведкі: *прырода, лісточкі, сонейка, сады, дрэвы і кусты.*

Устаўце замест кропак назвы прадметаў і запішыце сказы. Вусна пастаўце пытанні да ўсіх слоў.

154. Прачытайце сказы. Пастаўце пытанні да слоў, якія абазначаюць рух прадметаў.

1. Раніцаю залацістай у клас мы радасна ідзём. 2. Хутка коціць хвалі рэчка.

Спішыце. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць назвы дзеянняў прадметаў.

155. Прачытайце загадкі і адгадайце іх. Спішыце.



1. Рагатыя мяшкі надзелі кажушкі, гуляюць па лужку, а спяць у катушку.

2. Не рыба, а плыве, не конь, а ідзе, не пілка, а рэжа.



Падкрэсліце словы, якія абазначаюць назвы дзеянняў прадметаў.

156. Прачытайце. Дайце тэксту загаловак. Растлумачце правапіс слоў з выдзеленымі літарамі.

Я жыву ў Мінску. Раніцай мы ўсёй ся**м'ё**й пайшлі на плошчу **П**ерамогі. На ёй **у**звышаецца помнік г**е**роям вайны.

Як многа людзей прыходзіць сюды ў Дзень Перамогі! Колькі **ў**сюды кветак!

Мы таксама паклалі чырвоныя цюльпаны да Вечнага агню. В**я**сной і восе**нн**ю, летам і зімой, днём і но**чч**у гарыць ён у памяць абаронцаў **Р**адзімы.



157. Прачытайце. Падбярыце патрэбныя словы. Запішыце сказы.

1. Бабуля ... легенду дзецям. 2. Настаўніца ... вучням новую тэму. 3. Бацька ... з сынам. 4. Вучань ... на пытанне. 5. Пеця нешта ... сябру на вуха. 6. Коля ... у брата кнігу. 7. Міша ... у мамы: «Мы пойдзем у заапарк?»

Словы для даведкі: *тлумачыць, расказвае, адказвае, размаўляе, папрасіў, прашаптаў, запытаў.*

па́мяць



158. Прачытайце сказы. Падбярыце словы, якія абазначаюць адносіны паміж людзьмі. Запішыце.

1. Андрэйка ... сваю маму. І мама ... сына. 2. Арцём і Коля ... яшчэ з першага класа. 3. Дзеці, ... старэйшых і ... малодшых!

Словы для даведкі: *сябруюць, любіць, не крыўдзіце, паважайце.*

Якім сказам перадаецца заклік?

159. Прачытайце. Падбярыце словы, якія перадаюць веснавыя змены ў прыродзе.

Траўка … . Лісточкі … . Кветкі … . Дзень … . Птушкі … . Вожык … .

Словы для даведкі: *распускаюцца, зелянее, расцвітаюць, прыляцелі, прыбывае, прачнуўся.*

Складзіце сказы і запішыце іх.

по́дзвіг

160. Прачытайце. Якая тэма тэксту? Чаму некаторыя словы напісаны з вялікай літары?

Над Бугам шмат дзён і начэй грымелі моцныя баі. Абаронцы Брэсцкай крэпасці стрымлівалі націск ворага. Мужна змагаліся пагранічнікі Андрэй Кіжаватаў і Пятро Гаўрыленка.

Подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці назаўсёды застанецца ў нашай памяці.

Спішыце апошні сказ. Вызначце словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

161. Прачытайце тэкст.

Песні вясны

Дзеці павыходзілі на двор. Яны слухаюць песні вясны.

У небе звонка звініць жаваранак. На голай бярозе свішча шпак. У лесе спяваюць дразды. Ля возера крычаць качкі *(Паводле Я. Коласа)*.

Выпішыце сказы, у якіх расказваецца, як птушкі падаюць галасы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.



162. Адгадайце загадкі.


1. Стукае, грукае, а нідзе яго не відаць.
2. У шырокім полі салавей свішча.
3. Лёгкі, але не пух. Грэе, ды не кажух. Вясна настане — увесь растане.



Запішыце загадкі і адгадкі. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.

163. Прачытайце і адгадайце загадкі. Назавіце словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.

1. Не брэша, не кусае,
а ў хату не пускае.





2. Дзетак сваіх не гадуе,
нават гнязда не будуе,
звонка ў лесе кувае.
Што за птушка такая?

Запішыце. Падкрэсліце ***не*** са словамі, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.

Не са словамі, якія абазначаюць дзеянні прадметаў, пішацца асобна. Напрыклад: *не бачыў, не чуў*.

164. Прачытайце прымаўкі і растлумачце іх.

1. Белая зямля не родзіць жыта.
2. Дроў у лес не нясуць.
3. Без працы не пражывеш.

Запішыце. Падкрэсліце разам з ***не*** словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.

165. Прачытайце. Як пішацца ***не*** са словамі, якія абазначаюць дзеянні прадметаў?

Чужым розумам *(не)* пражывеш.
Справу словам *(не)* заменіш.
Адклад *(не)* ідзе на лад.
Языком работы *(не)* зробіш.

Спішыце. Раскрыйце дужкі.
Растлумачце правапіс выдзеленых літар.



166. Прачытайце тэкст. Якая яго тэма? Як вы разумееце выдзеленыя словы?

Вясновыя клопаты

Зямля вясною ажывае.

У полі людзі працуюць. Цяпер тая пара, калі **адзін дзень год корміц.**

Паводле В. Вольскага

Спішыце. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.


Падзяліце для пераносу слова *ажывае*.

ПРЫНАЗОЎНІК



Для чаго патрэбны прыназоўнікі ў мове?

167. Разгледзьце малюнак.



Адкажыце на пытанні.

Дзе сядзіць заяц?
Куды схаваўся вожык?
Дзе знаходзіцца мышаня?
Куды падышло аленяня?
Дзе лётае матылёк?

Адказы запішыце, выкарыстайце словы ***на, за, над, пад, да;*** гэтыя словы падкрэсліце.

168. Прачытайце. Як звязваюцца словы паміж сабой?

вучыцца школе	вучыцца **ў** школе
працуе заводзе	працуе **на** заводзе
схаваўся кустом	схаваўся **пад** кустом
ляцяць зямлёй	ляцяць **над** зямлёй

Запішыце спалучэнні слоў. Падкрэсліце прыназоўнікі.

Словы ***у, на, над, з, за, з-за, да, ад, па, пад*** служаць для сувязі слоў у сказе — гэта прыназоўнікі. Прыназоўнікі пішуцца заўсёды асобна ад іншых слоў у сказе: *У вароны гняздо* ***на*** *ліпе.*

169. Прачытайце сказы. Устаўце патрэбныя прыназоўнікі.

Мая бабуля жыве (дзе?) ... вёсцы.	над
Кніга ляжыць (на чым?) ... стале.	за
(Дзе?) ... ракой раскінуўся шырокі луг.	у
(Над чым?) ... полем сцелецца нізкі туман.	на

Запішыце сказы.



170. Прачытайце сказы.

1. *Міша прачнуўся* (калі?) *у сем гадзін раніцы.*
2. Хлопчыкі гулялі (...) у футбол.
3. Дзеці весела смяяліся (...) з жартаў клоўна.
4. Сонца схавалася (...) за дах высокага дома.

Спішыце. У дужках запішыце пытанні. Падкрэсліце прыназоўнікі.

171. Прачытайце. Падбярыце прыназоўнікі, якія нададуць спалучэнням супрацьлеглае значэнне.

У з о р. *Пайсці **ў** школу — прыйсці **са** школы.*

Растуць **перад** домам — растуць ... домам.
Гуляць **да** абеду — гуляць ... абеду.
Ляжыць **на** стале — ляжыць ... сталом.

172. Разгледзьце малюнак. Прачытайце тэкст. Раскажыце, што здарылася з хлопчыкамі ў лесе.

Пеця з Мішам пайшлі ў лес. У старым дрэве яны знайшлі пчалінае дупло. Міша



палез на дрэва. З дупла вылецелі пчолы. Міша саскочыў на зямлю. Пчолы паляцелі за хлопчыкамі.

Спішыце тэкст. Падкрэсліце прыназоўнікі.

173. Прачытайце. Да выдзеленых слоў пастаўце пытанні. Назавіце прыназоўнікі.

Раптоўна сонца схавалася **за хмару.** Зашумелі дрэвы. **Па небе** секанула маланка. Усё наваколле скаланулася **ад грому.** Дождж ішоў нядоўга. Зноў **у небе** заззяла сонца. **У садзе** загаманілі, заспявалі птушкі.

Паводле І. Муравейкі



174. Прачытайце, устаўце патрэбныя прыназоўнікі. Запішыце сказы.

1. Сонца спаць пайшло ... горку.
2. Скачуць ножкі ... сцяжынках.
3. Сонейка свеціць ярка ... краем.

Словы для даведкі: *над, за, па.*

АСНОВА І КАНЧАТАК СЛОВА



Як называецца зменная частка слова?
Для чаго патрэбны канчаткі?
Як вылучыць канчатак у слове?
Што такое аснова слова?

175. Прачытайце. У слове *вада* назавіце тую частку, якая змяняецца.

Усім патрэбна (ш т о?) **вада**. Нельга жыць (б е з ч а г о?) без **вады**. П'ём (ш т о?) **ваду**. Мыемся (ч ы м?) **вадой**. Купаемся (у ч ы м?) у **вадзе**.



Канчатак — гэта зменная частка слова. Напрыклад: *стол — на ста-ле, працуе — працу***юць***, вясёл***ы*** — вясёл***ая***.

Канчатак служыць для сувязі слоў у сказе. Напрыклад: *На вадзе цвіце гарлачык*. Канчатак абазначаецца ☐: сонц **[а]**.

176. Прачытайце. Якая частка слоў прапушчана?

Па лесе бяжыць ліс.. . У ліс.. прыгожае футра. Мы набліжаемся да ліс.. , хочам лепш разгледзець яе. Але за ліс.. цяжка назіраць. Хітрая махлярка хутка знікла з вачэй. Нездарма пра ліс.. складзена так многа казак.

Спішыце, дапісваючы канчаткі.

177. Прачытайце тэкст. Словы, што ў дужках, змяняйце, як патрабуе сэнс.

Скончылася зіма. Пасля *(зіма)* прыйшла вясна. Вяртаюцца з выраю *(птушка)*. Іх чакаюць *(родная мясціна)*.

Спішыце. Абазначце канчаткі ў змененых словах.

Каб знайсці канчатак, трэба змяніць форму слова: вясн**а**, вясн**ы**, вясн**е**, вясн**у**, вясн**ой**.

178. Змяніце канчаткі так, каб змянілася колькасць прадметаў.

Шапка — ..., ліса — ..., хата — ..., дрэва — ..., ластаўка — ... .

Запішыце па ўзоры, канчаткі абазначце.

У з о р: *птушк*[*а*] — *птушк*[*і*].



179. Прачытайце тэкст.

Бабры будуюць свае хаткі на беразе ракі. Для будаўніцтва бабры выкарыстоўваюць асіны і бярозы. Яны змазваюць галіны і сучча глеем з дна ракі. Хады ў сваё жыллё бабры робяць пад вадой. Так зручней трапляць у хатку.

Спішыце тры першыя сказы. Абазначце канчаткі ў словах — назвах прадметаў.

180. Прачытайце словы. Назавіце канчаткі. Якая частка слоў засталася нязменнай?

барацьба	чытаю	глыбокі
барацьбу	чытаеш	глыбокая
у барацьбе	чытаюць	глыбокія


Частка слова без канчатка называецца ***асновай***. Аснова — нязменная частка слова. Аснова абазначаецца ______. Напрыклад: *сястр*[*а*], *цяжк*[*і*], *бяг*[*у*].

181. Прачытайце тэкст.

Прыёмныя качаняты

Ходзяць **гусі** ланцужком:
гу́сачка за **гусако́м**,
а за імі — **гусяняты**
і малыя качаняты.
Прытуліла, як свая,
іх **гусіная** сям'я.

З. Марозаў



Выпішыце выдзеленыя словы. Абазначце аснову і канчатак.

182. Прачытайце. Пастаўце пытанні да выдзеленых слоў.

Ласкавае **сонейка,** цёплая **вада, на** высокім **дубе, да** старой **сасны, у** сінім **небе,**

яркі **агеньчык,** маленькае **птушанё,** добры **хлопчык,** прыгожая **дзяўчынка.**

Спішыце. Выдзеліце канчаткі, падкрэсліце аснову ў словах.

183. Прачытайце. Замест пытанняў устаўце слова *сасна.*

У лесе расце (ш т о?) ... . На (ч ы м?) ... у дупле знайшлі сабе прытулак вавёркі. А пад (ч ы м?) ... вожык зрабіў сабе норку.

Запішыце тэкст. У слове *сасна* абазначце аснову і канчатак.



184. Спішыце сказы. У слове *Радзіма* абазначце аснову і канчатак.

1. Без Радзімы не можа быць шчаслівы ні адзін чалавек.
2. Пісьменнікі прысвячаюць свае творы Радзіме.
3. Мы ганарымся сваёй Радзімай.

Праверце сябе

1. Назавіце словы, якія адказваюць на пытанне х т о?

Машына, метро, ракета, рыба, мурашка.

2. У якім радку словы адказваюць на пытанні я к і? я к а я? я к о е? я к і я?

а) цукар, пячэнне, яблык, соль;
б) салодкі, смачная, салёнае, кіслыя;
в) бегаў, соліць, купілі, зрывае

3. Знайдзі словы, якія абазначаюць назвы дзеянняў.

1. Зубры ў гушчары пратапталі сцежкі.
2. Высока ў небе спявае жаваранак.
3. Пасярод лесу працякаў ручай.

4. Запішыце сказы, раскрываючы дужкі.

Хадзіў дзед (на)паляванне. Паляваў (ад)ранку (да)змяркання. Зморыцца, аж слова (не) прамовіць, а звярыны (не)зловіць *(З народнага)*.

ПАЎТАРЭННЕ

185. Прачытайце. Колькі сказаў у тэксце?
Назавіце словы, у якіх 5 складоў.
У выдзеленым слове назавіце гукі. Якімі літарамі яны абазначаюцца?

Сцежкамі паэта

За Пінскам ёсць **невялікая** вёска. Абапал дарогі стаяць акуратныя домікі. Гэта вёска Пінкавічы. Тут калісьці працаваў настаўнікам Якуб Колас. Шмат твораў пра родны край ён напісаў у Пінкавічах.
Паводле С. Александровіча



Спішыце тэкст.

186. Прачытайце.

Настаўніца дала вучням заданне падзяліць словы для пераносу.

Алёша запісаў словы так: лоў-кія, зай-чанят-кі, мядзве-дзі, кро-пелькі.

— А інакш можна перанесці? — спытала настаўніца.

— Можна, — не задумваючыся адказаў вучань і зрабіў іншы падзел.

Які падзел слоў для пераносу зрабіў Алёша? Ці можна перанесці слова *лоўкія* па-іншаму?

187. Прачытайце тэкст. Назавіце словы, якія дапамагаюць звязаць сказы ў тэксце. Растлумачце правапіс літар ***у*** і ***ў***.

Пасля школы

Вадзім прыйшоў са школы. Пасля кароткага адпачынку ён узяўся за ўрокі. Хлопчык не заўважыў, як хутка прайшоў час. Нарэшце ўрокі былі зроблены. Цяпер можна і пагуляць.

Паводле П. Рунца

Спішыце тэкст. У першых двух сказах падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў кожным сказе і што гаворыцца.

188. Прачытайце сказы. Назавіце словы, якія абазначаюць, пра каго (пра што) гаворыцца ў кожным сказе і што гаворыцца.

Пастаўце пытанні да іншых слоў у сказах.

1. Сонейка в..сновае радасна ..сміхаецца *(У. Карызна)*.
2. Голу.. кружыць пад блакітным небам *(Я. Брыль)*.
3. Пчолкі л..цяць да красак м..довых *(Ю. Свірка)*.
4. До..гі дзень адплывае за аблокі *(Г. Бураўкін)*.
5. Пайшоў шпак на шашу *(В. Вітка)*.

Спішыце сказы, устаўце патрэбныя літары і растлумачце іх напісанне.

189. Прачытайце сказы. Пра каго (пра што) гаворыцца ў кожным сказе? Што гаворыцца?

1. Жылы дрэў напоўніліся сокам.
2. Ручаі імкнуцца да ракі.
3. Пяюць вясёлыя шпакі.

Спішыце. Падкрэсліце словы, у якіх тры склады.

190. Прачытайце з патрэбнай інтанацыяй.

— Мышка, мышка, дзе была
— Была ў пана караля
— Што рабіла
— Лыжкі мыла
— А што далі
— Кусок сала
— Дзе паклала
— Пад лаўкаю
— Дзе падзела
— Кошка з’ела
— Бяжым за кошкаю *(З народнага)*.



Спішыце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў канцы сказаў.

191. Прачытайце. Што абазначаюць гэтыя словы: назвы прадметаў, назвы прымет прадметаў або назвы дзеянняў прадметаў?

Зямля, сонца, залаты, зялёны, працаваць, вучыцца, лес, любіць, багаты, прыгожы, ісці, школа, настаўніца, маці, добрая, дапамагаць.

Запішыце так:

Назвы прадметаў: зямля, ...

Назвы прымет прадметаў: залаты, ...

Назвы дзеянняў прадметаў: працаваць, ...

192. Прачытайце тэкст.

З даўным-даўна **буслы, бусліцы**
тут гадаваліся, жылі,
бо ўжо найлепшае сталіцы
на ўсёй акрузе не знайшлі.
Тут ім — **балоты, азярыны,**
рачны блакіт і шыр **лугоў.**
Таму і гнёздаў шмат **бусліных**
у Бу́слаўцы спакон вякоў *(А. Русак)*.

Выпішыце з верша выдзеленыя словы, абазначце канчаткі.

193. Прачытайце тэкст. Колькі ў ім частак? Падбярыце загаловак да тэксту.

Сыпануў цёплы дождджык. Дзеці бегаюць пад дождджыкам і весела крычаць:

«Дожджык, дожджык, сыпані, мы паедзем на кані!»

Дожджык быў спорны. Дзеці пахаваліся ў хату і там ужо крычалі: «Дожджык, дожджык, секані, усіх у хату загані!»

Пасля дожджыку яны ўжо крычалі: «Дожджык, дожджык, ужо канчайся! Дзетвара, гуляць збірайся!»

Паводле В. Хомчанкі

Назавіце гукі ў слове *дожджык.* Якімі літарамі яны абазначаны?



194. Разгледзьце малюнкі.

Чым пахнуць кветкі?



Раскажыце па плане.

1. Як цудоўна пахнуць кветкі!
2. Я не ведаў, што кветкі мёдам пахнуць.
3. Кветкі — убранне зямлі.

Запішыце апавяданне, якое вы склалі.

195. Прачытайце лічылку. Назавіце гукі ў выдзеленых словах. Якія гэта гукі?

Лічылка

Антон купіў **батон**,
раскрыў **парасон**,
паляцеў на **балкон**,
сеў на **бітон**,
рэзаў **кардон**,
еў **лімон**.
Вагон, талон, сіфон —
выйдзі **вон**!

У. Лінскі

Выпішыце выдзеленыя словы. Растлумачце іх значэнне.

Прыдумайце самі падобную лічылку.



196. Прачытайце.

Гулялі дзеці ў двары. Бачаць: бяжыць вожык па дарожцы. Прыціхлі, назіраць сталі. А з-за кустоў выйшла кошка. Яна таксама звярка ўбачыла. Скокнула кошка на калючага вожыка...

Прыдумайце працяг тэксту.



Размаўляем па тэлефоне

197. Прачытайце запіс размовы па тэлефоне аднаго хлопчыка. Ці ветлівы гэты хлопчык?



— Добры дзень. Паклічце, калі ласка, Сашу.

— ...

— А калі ён прыйдзе?

— ...

— Скажыце яму, калі ласка, што тэлефанаваў Ігар.

— ...

— Дзякую. Да пабачэння.


Выпішыце словы ветлівасці.

198. Уявіце, што ў вашай кватэры зазваніў тэлефон. Нехта просіць паклікаць маму. Але мамы дома няма. Што вы скажаце гэтаму чалавеку?

Падрыхтуйце размову з суседам па парце.

199. Прачытайце верш Сяргея Грахоўскага. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

Пр**ы**ходзіць лета звонкае
птуш**ы**наю гамонкаю.
Над сінімі азёрамі
яно **ў**зыходзіць зорамі,
а пахне м**е**дуніцамі
і спелымі суніцамі.
Куды ні глянь — усюды
цябе чакаюць цуды.
Цябе чакаюць сце**ж**кі
і радасныя **ў**сме**ш**кі,
лугі, л**я**сы, палі
і шчасце на з**я**млі.



СЛОЎНІК

Сям'я

бабу́ля
брат
дачка́
дзяду́ля
ма́ма
праба́бка
пра́дзед
сын
сястра́
та́та
уну́к
уну́чка

Школа

ало́вак
ву́чань
кані́кулы
клас
кні́га
наста́ўніца
падру́чнік
пена́л
перапы́нак
сшы́так
уро́к
чвэрць

Дні тыдня

панядзе́лак
аўто́рак
серада́
чацве́р
пя́тніца
субо́та
нядзе́ля

Назвы месяцаў

сту́дзень
лю́ты
сакаві́к
красаві́к
май
чэ́рвень

лі́пень
жні́вень
ве́расень
кастры́чнік
лістапа́д
сне́жань

Гарады Беларусі

Бабру́йск
Бара́навічы
Брэст
Ві́цебск
Го́мель
Гро́дна
Жо́дзіна

Івацэ́вічы
Магілёў
Мазы́р
Мінск
Пінск
По́лацк
Салігó́рск

Рэкі і азёры Беларусі

Брасла́ўскія азёры
Бярэ́зіна
Гары́нь
Дзвіна́
Дняпро́

На́рач
Нёман
Пры́пяць
Сві́слач
Сві́цязь

Агароднiна і садавiна

агуро́к
бура́к
капу́ста
кроп
мо́рква
памідо́р

рэ́дзька
сала́та
цыбу́ля
чарэ́шня
часно́к
я́блык

Ягады і грыбы

агрэ́ст
ажы́ны
апе́нька
бараві́к
брусні́цы
буякі́
журавí́ны
лісі́чка
малі́ны

масля́к
мухамо́р
падасі́навік
падбяро́завік
ры́жык
суні́цы
сырае́жка
чарні́цы
шампіньён

Зерневыя культуры

авёс
грэ́чка
жы́та

про́са
пшані́ца
ячме́нь

Дрэвы і кусты

але́шына (во́льха)
арэ́шына (ляшчы́на)
асі́на
бяро́за
ві́шня
вярба́
гру́ша
дуб
е́лка
клён
лаза́
лі́па
малі́на
парэ́чкі
рабі́на
сасна́
слі́ва
я́блыня

Дзікія жывёлы

але́нь
бабёр
барсу́к
вавёрка
во́жык
воўк
дзік
за́яц
зубр
казу́ля
лісі́ца
лось
мядзве́дзь
рысь

Дзікія птушкі

аўся́нка
бу́сел
варо́на
верабе́й
го́луб
дзя́цел
дрозд
жа́варанак
жураве́ль
зязю́ля
каршу́н
крыжадзю́б
ла́стаўка
сава́
салаве́й
саро́ка
сі́ніца
снягі́р
со́кал
шпак

Адзенне і абутак

бо́ты
валёнкі
кажу́х
касцю́м
кашу́ля
ку́ртка
паліто́
сарафа́н
спадні́ца
суке́нка
ту́флі
хала́т
чараві́кі
штаны́

ЗМЕСТ

(Назва і нумар школы)

Навучальны год	Імя і прозвішча вучня	Стан падручніка пры атрыманні	Адзнака вучню за карыстанне падручнікам
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			

Вучэбнае выданне

Паўлоўскі Іван Іванавіч
Леўкіна Лідзія Фёдараўна

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Падручнік для 2 класа
агульнаадукацыйных устаноў з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках
Частка 2

2-е выданне,
перагледжанае і дапоўненае

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*.
Рэдактар *Л. Б. Сопат*. Мастацкі рэдактар *І. А. Усенка*.
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Брыкет*. Карэктар *Н. М. Кумагер*

Падпісана ў друк 23.03.2011. Фармат 70×90 $^1/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура Школьная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 7,5.
Ул.-выд. арк. 3,2 + 0,47 форз. Тыраж 21 600 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛВ № 02330/0494469 ад 08.04.2009. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
ЛП № 02330/0150496 ад 11.03.2009. Вул. Чырвоная, 23, 220600, г. Мінск